# Клаўнада на кніжнай паліцы



Сваю маленькую краіну казкі і дабра Павел стварае шмат гадоў.

**Першага цацачнага клоўна Павел Сапоцька купіў у дзяцінстве. Цяпер ён студэнт апошняга курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, і ў яго калекцыі – 137 вясёлых персанажаў.**

Мы пазнаёміліся з Паўлам у верасні ў час турыстычнай паездкі маладзечанцаў у Прагу, Карлавы Вары і Дрэздэн. Пасля чарговага напружанага экскурсійнага дня група энтузіястаў вырашыла прагуляцца па начной Празе. Сувенірныя магазінчыкі ў цэнтры працуюць ледзь не ўсю ноч. Павел папрасіў нас пачакаць яго каля аднаго з іх і праз хвілін дзесяць выйшаў са шчаслівай усмешкай на твары: «Я проста не мог прайсці міма такога шыкоўнага клоўна-марыянеткі!». У Карлавых Варах ён набыў драўлянага клоўна на драцяной спіральцы, які вельмі пацешна падскоквае, у Дрэздэне – сімпатычнага скамароха ў шапцы са званочкамі. З той паездкі ён прывёз пяць новых экзэмпляраў для сваёй незвычайнай калекцыі, якая займае ледзь не ўсе гарызантальныя паверхні яго пакоя ў кватэры ў Маладзечне. І ў Мінску на здымнай кватэры пасяліліся вясёлыя і сумныя клоўны, іншыя статуэткі – нязменныя сувеніры са шматлікіх паездак, падарункі родных і сяброў.



Немагчыма было прайсці міма клоўна, зробленага пражскімі майстрамі.

А пачалося гэта захапленне з тэлефільма «Мама» — шыкоўнай музычнай інтэрпрэтацыі вядомай усім з дзяцінства казкі пра ваўка і семярых казлянят. Пашу не столькі ўразілі Людміла Гурчанка з Міхаілам Баярскім, якія пераўвасобіліся ў казу і ваўка, колькі другарадная роля клоўна, якую бліскуча выканаў вядомы ў савецкія часы артыст Алег Папоў. Ён настолькі ўразіў чатырохгадовага Пашу, што той нават ціхенька прасіў Дзеда Мароза, каб клоўн з фільма прыйшоў да яго дадому. А калі неўзабаве ў вітрыне кіёска каля магазіна «1000 дробязей» убачыў маленькага цацачнага клоўна, упрасіў маму купіць яго. Хлопчык любіў і машынкі, нават нейкі час збіраў мадэлі, аднак гэта прайшло, а клоўны цікавяць яго і цяпер. «Але толькі не ў цырку!» — гаворыць Павел і ўспамінае яшчэ адзін фільм: «Карнавальная ноч-2, ці 50 гадоў пасля», у якім расійскі акцёр Уладзімір Зельдзін выканаў ролю клоўна. Павел нават запомніў яго сумную песеньку:

«Старый клоун на манеже:
капли пота, белый лик,
Старомодные одежды
и растрёпанный парик.
Допотопные репризы,
надоедливый куплет.
И глаза полны печали,
и в карманах денег нет...»

Самы вялікі і дарагі ў яго калекцыі – клоўн-скарбонка, набіты савецкімі манеткамі, якія падарылі свайму адзінаму сыну 23 лютага бацькі Алена Уладзіміраўна і Міхаіл Станіслававіч. Спачатку ім было дзіўна, што сына больш за машынкі і пісталеты цікавяць сувеніры, але яго захапленне яны паважаюць, любяць іншы раз і самі паслухаць гісторыі, разглядзець новыя экзэмпляры. З цягам часу калекцыя стала папаўняцца не толькі клоўнамі, але і іншымі вясёлымі персанажамі. У Севастопалі Павел купіў маракоў у цяльняшках у гонар таты, які служыў у марскім флоце. З Масквы прывёз анёла, зробленага па тыпу матрошкі, унутры якога знаходзіцца яйка. Гэта велікодная аўтарская работа мастака з Ніжняга Ноўгарада, які нават пакінуў на ёй аўтограф. Ёсць антыкварныя вельмі далікатныя фарфоравыя хлопчыкі і дзяўчынкі, якія нагадваюць нам пра савецкія часы са слонікамі ў буфетах... Цікавыя гліняныя вырабы радашковіцкіх майстроў. Вельмі парадавала майго субяседніка маладзечанская мастачка Галіна Сушко, якая падарыла ляльку ўласнай работы.

— А фігурку гэтага сімпатычнага бухгалтара я купіў у сталічным ГУМе ў той дзень, калі даведаўся, што паступіў ва ўніверсітэт культуры і мастацтваў, — прыгадвае ўладальнік калекцыі.

Дарэчы, на факультэце культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці Павел вучыцца «на выдатна», піша навуковыя работы, пастаянна друкуецца ў «ЛіМе», «Культуры», «Краязнаўчай газеце», прымае ўдзел у канферэнцыях. На трэцім курсе ён стаў стыпендыятам Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. Месяц таму актыўнага і працавітага хлопца ўключылі ў склад Рады Беларускага фонду культуры, а цяпер па яго ініцыятыве рэгіструецца абласное аддзяленне БФК. Акрамя таго, ён з'яўляецца адказным сакратаром – намеснікам старшыні Праўлення фонду «Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага».

Сваю дыпломную работу Павел прысвяціў культурнаму іміджу Беларусі, неад'емнай часткай якога з'яўляецца і сувенірная прадукцыя, да якой ён неабыякавы. Так што пра сваю калекцыю Павел расказвае не як дылетант, а як прафесіянал. Ён унікае ва ўсе тонкасці гэтай галіны, ганарыцца, што прадукцыя Маладзечанскай фабрыкі мастацкіх вырабаў карыстаецца вялікай папулярнасцю як у нашай краіне, так і за мяжой. Ільняная лялька, дарэчы, таксама ёсць у калекцыі майго субяседніка. Калі ж зайшла размова пра тое, хто стварае імідж нашага горада, Павел найперш назваў сімфанічны аркестр музычнага каледжа імя М.-К. Агінскага пад кіраўніцтвам Рыгора Сарокі, з вялікай павагай гаворыць ён і пра мастакоў Кастуся Харашэвіча, Рыгора Мяжуева, Васіля Лазоўскага. А карціна, якая відаць на здымку, напісана самім Паўлам у тэхніцы бацыка – роспісу па тканіне. Ён у свой час займаўся ў мастацкай школе.

Чым больш мы размаўлялі з гэтым маладым чалавекам, тым больш я пераконвалася, што спецыяльнасць культуролага-менеджара Павел выбраў не выпадкова – яшчэ студэнтам ён уносіць немалы ўклад у развіццё гэтай сферы. Не за гарамі абарона дыплома. Ужо цяпер можна прадбачыць, што для здольнага хлопца яна будзе паспяховай і што ў гонар гэтай знамянальнай падзеі, як і ўсіх іншых, Павел Сапоцька купіць новага клоўна ці якога-небудзь іншага казачнага героя.

**Анжаліка КРУПЯНЬКОВА.**
**Тэл. 77-19-61.**
**Фота Аляксея ПЛАТКО.**



У гэтых фігурках – майстэрства і пачуццё гумару радашковіцкіх ганчароў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ